Уражанні

# ПРА ЗЕМБІН — СЛАЎНЫ АГРАГАРАДОК

**Доўгія гады мы мала цікавіліся гісторыяй сваёй краіны, свайго роду, абыякава адносіліся да матэрыялаў сямейных архіваў, мала было жадання пазнаваць нешта новае, цікавае, незвычайнае.**

Прыгадваю свае школьныя гады. Гісторыя Беларусі для нас пачыналася ад 1917 года. А што было да гэтага, то ў падручніку або замоўчвалася, або падавалася як суцэльная цемра і галеча. І толькі ў суверэннай Беларусі нам сталі даступныя больш глыбокія і аб'ектыўныя веды. Мы, напрыклад, даведаліся пра існаванне Полацкага княства як першаасновы беларускай дзяржаўнасці. З гонарам прачыталі хвалюючыя старонкі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Больш поўныя і праўдзівыя веды атрымалі пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, складанасці пасляваеннага аднаўлення разбуранай народнай гаспадаркі, поспехі і праблемы будаўніцтва сацыялізму ў СССР. З захапленнем пазнаёміліся з многімі выдатнымі сынамі і дочкамі Айчыны.

Асаблівая ўвага гэтым пытанням аддаецца апошнім часам. Былі абвешчаны гады малой радзімы (тройчы запар), Год гістарычнай памяці, Год міру і стваральнай працы. Усё гэта, безумоўна, паспрыяла больш актыўнаму засваенню нашага мінулага і нашага сённяшняга, дзейснаму патрыятычнаму выхаванню людзей.

Аб гэтым міжволі думалася мне, калі я чытаў кнігу Ліліяны Анцух «Зембін: кароткі экскурс у гісторыю і сучаснасць. Жыццяпіс зембінцаў» — дакументальнае даследаванне пра аграгарадок Зембін, што на Барысаўшчыне. Скажу адразу: кніга захапіла мяне літаральна з першых старонак. Я, напэўна, як і многія з беларусаў, канешне ж, чуў пра Зембін, але і бізка не ведаў, што гэтае мястэчка мае такую даўнюю і цікавую гісторыю.

Аказваецца, Зембін упершыню ўпамінаецца ў летапісных крыніцах яшчэ ў 1526 годзе. Гэта значыць, што мястэчка (цяперашні аграгарадок) праз некалькі гадоў будзе адзначаць сваё 500-годдзе. Шаноўны юбілей!

Цікава было дазнацца, што на працягу гэтых гадоў Зембінам валодалі многія тагачасныя магнаты — Радзівілы, род Кішкаў, Саковічаў, Храптовічаў... Усе яны, хто ў большай ступені, хто ў меншай, садзейнічалі развіццю мястэчка, стваралі ўмовы для вядзення гандлю. У 1777 годзе, напрыклад, тут было 38 двароў, карчма, бровар і два вадзяныя млыны. А праз тры дзесяцігоддзі мелася ўжо тры карчмы, бальніца, школа, чатыры кузні і 23 (!) крамы.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі мястэчка ў сваім развіцці атрымала новы ўхіл — адукацыйна-культурны. Са старонак кнігі даведваемся, што ў 1918 годзе ў Зембіне было адкрыта вышэйшае пачатковае вучылішча, пазней ператворанае ў працоўную школу 2-й ступені. У дваццатыя гады працавалі клуб, хата-чытальня, дзейнічаў драматычны гурток.

Разам з тым сур'ёзная ўвага ўдзялялася і развіццю тагачаснай прамысловасці: працавала лясніцтва, дзве маслабойні, тры кузні, ваўначоска, дзве ганчарныя майстэрні, майстэрня па апрацоўцы скур. А на пачатку 1922 года (яшчэ задоўга да масавай калектывізацыі) была арганізавана сельскагаспадарчая арцель «Чырвоны Араты».

Нельга без душэўнага ўзрушэння чытаць старонкі кнігі, дзе апавядаецца пра тое, што адбывалася на зембінскай зямлі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў 1942 годзе ў Зембіне пачала дзейнічаць падпольная арганізацыя, якая падтрымлівала сувязь з Барысаўскім гарадскім падполлем і партызанскай брыгадай «Дзядзькі Колі». Рызыкуючы жыццём, падпольшчыкі дастаўлялі партызанам прадукты харчавання, неабходныя медыкаменты, інфармацыю пра мясцовы гарнізон акупантаў, распаўсюджвалі лістоўкі.

Апавядаючы пра мужнасць і гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, Ліліяна Анцух не абмінае і драматычных, а часам трагічных падзей таго часу. Скажам, пра лёс насельнікаў Зембінскага гета. Як расказваюць сведкі тых падзей Аляксандр Разенблюм і Ганна Скумс, 18 жніўня 1941 года ўсіх яўрэяў сабралі на Кірмашовай плошчы нібыта для праверкі дакументаў. А пасля групамі па пятнаццаць-дваццаць чалавек адводзілі да выкапанай у наваколлі мястэчка ямы і бязлітасна расстрэльвалі. Усяго было забіта 927 яўрэяў — мужчын, жанчын, дзяцей.

Гэта жудасная, крывавая акцыя была ажыццёўлена (у кнізе называюцца канкрэтныя прозвішчы, і гэта вельмі важна!) акупантамі пад кіраўніцтвам начальніка Барысаўскай службы бяспекі (СД) гаўптштурмфюрара Шонемана пры ўдзеле гестапаўцаў Берга і Вальтэра, каменданта Барысава Шэрара, каменданта Зембіна Ілека, а таксама перакладчыка Люцке і фашысцкіх памагатых В. Харытановіча, Д. Эгофа, П. Кабакова і іншых.

Не сумняваюся і ў тым, што чытачы кнігі з вялікай увагай пазнаёмяцца з фактамі (яркімі, красамоўнымі) пасляваеннага жыцця зембінцаў, іх сучаснымі дасягненнямі. Пры гэтым у падтэксце выразна прачытваецца важная выснова аўтара: патрыятызм заключаецца не ў гучных словах, а ў добрых, карысных справах.

Нельга не пагадзіцца са слушнай думкай Ліліяны Анцух аб тым, што ў адраджэнні і развіцці любога самага маленькага мястэчка вялікую ролю адыгрываюць асобы, якія любяць, цэняць і клапатліва захоўваюць яго гісторыю, дзейсна клапоцяцца аб памнажэнні яго матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў. Для іх, як зазначае аўтар, малая радзіма — не толькі месца з'яўлення на свет, але і прастора, пра якую трэба заўсёды памятаць і рупіцца аб яе развіцці.

На самым пачатку я сказаў, што рукапіс кнігі мяне адразу ж захапіў. Цяпер магу дадаць: не толькі захапіў, але і ўразіў. Уразіў глыбінёй пранікнення аўтара ў гісторыю старажытнага мястэчка, паўнатой і разнастайнасцю аповеду пра яго сучасныя будні. Ліліяна Анцух надзвычай адказна падышла да вырашэння пастаўленай мэты — стварыць пра Зембін цікавую, паўнавартасную кнігу. Гэтаму паслужылі шматлікія дакументальныя і архіўныя крыніцы, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, успаміны відавочцаў знакавых для мястэчка падзей, сустрэчы і гутаркі з сучаснікамі.

Упэўнены, што кніга будзе з цікавасцю сустрэта шматлікімі чытачамі. І, безумоўна, яна надасць новы імпульс развіццю актыўнага краязнаўства, вывучэнню свайго роду, сваіх каранёў. А ў канчатковым выніку — пазнанню гісторыі сваёй Айчыны.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ,**
**заслужаны**
**дзеяч культуры**
**Рэспублікі Беларусь.**


Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец:** ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. Тел. (0154) 65 25 01

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by

| Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|
| **Предмет электронных торгов: клеточное оборудование птичника № 12 «Унивент-550 л»** (бывший в употреблении), 2009 г. в., инв. номер 5011, расположенный по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. Докучаева, 28 | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. – 172 800,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 01.09.2023 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: 10.00 **04.03.2024 г.**
Окончание торгов: 11.00. **04.03.2024 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.03.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов: **ООО «ТрастАудитКонсалт»** (УНП 692017051), 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел.: (8029) 777-91-61.
Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **05.03.2024 г. 15.00** по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14.
Подробное содержание спецификаций к лотам размещено на сайте **www.truster.by**

**Продавец: ООО «Фелиско» (УНП 192356085)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 1 | Торговые вывески (спецификация 1) | 900,00 |
| 2 | Мебель торговая (спецификация 2) | 1200,00 |
| 3 | Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Немига) (спецификация 3) | 3000,00 |
| 4 | Компьютерная техника и оборудование (спецификация 4) | 1520,00 |
| 5 | Офисная мебель (спецификация 5) | 900,00 |
| 6 | Световой комплекс (спецификация 6) | 360,00 |
| 7 | Комплект торгового оборудования магазина «Физкульт» (Замок) (спецификация 7) | 3300,00 |
| 8 | Климатическое оборудование и витрины (спецификация 8) | 950,00 |

**Местонахождение имущества: г. Минск, Долгиновский тракт, 51Б**

**Продавец: ИООО «РСМТРАКС» (УНП 190632458)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС, BYN |
|---|---|---|
| 9 | Запчасти для грузовых автомобилей Renault, Volvo, JAC и др. (спецификация 9) | 11943,00 |
| 10 | Офисная мебель (спецификация 10) | 234,00 |
| 11 | Компьютерная техника (спецификация 11) | 256,50 |
| 12 | Инструмент и оснастка для ремонта автотехники (спецификация 12) | 1260,00 |
| 13 | Стеллажи универсальные (спецификация 13) | 337,50 |

**Местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14**

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.
**Для участия в торгах необходимо в срок до 04.03.2024 до 15.00:**
1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах по адресу: 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14 либо на электронную почту info@truster.by;
2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88UNBS3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ БАНК», код UNBSBY2X, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов, если иное не установлено договором.

Извещения о ранее проведенных торгах – 12.06.2023, 05.08.2023, 28.09.2023.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 29 февраля 2024 г. проводит 1-й от 15 февраля 2024 г. повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой автокран MAZ 5337 00 кузов (рама). № Y3M53370010039461 рег. № AI 6295-2 2001 г. *пробег 46465 км* | г. Минск, ГААСУ «Авиация» МЧС РБ | 82 600,00 | 16 520,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 29 февраля 2024 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 26 февраля 2024 г**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **29 февраля 2024 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: 8 (017) 319-35-41, +375 (44) 585 76 82. Электронная почта: **auk@bsk.by**.

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru и https://bsk.by.**